Лічбавая эканоміка

# У ПВТ — ПАПАЎНЕННЕ

**Назіральны савет ПВТ прыняў рашэнне аб рэгістрацыі 61 кампаніі. Сярод новых рэзідэнтаў ёсць шмат прапаноў для розных галін прамысловасці і інтэрнэту рэчаў. Так, кампанія «ІТАСТ» займаецца распрацоўкай праграмнага забеспячэння для высокатэхналагічных вытворчасцяў, а таксама мабільнай праграмы для палягчэння паездак на гарадскіх маршрутах грамадскага транспарту.**

Рэзідэнт «ТрыІнком» працуе над удасканаленнем бескантактавых плацяжоў, аплатай па QR-кодзе. «Какаду Дэвелапмент» распрацоўвае рашэнні для аўтаматызацыі магазінаў без касіраў. «КАТЭК-Інжынірынг» займаецца маніторынгам і кіраваннем сістэмамі энергазабеспячэння аб'ектаў інфраструктуры ўсіх сфер эканомікі. «Цэнтр сістэм ідэнтыфікацыі» плануе распрацоўку, укараненне і суправаджэнне праектаў на аснове тэхналогій аўтаматычнай ідэнтыфікацыі (RFID-пазнакі), электроннага бізнесу, інтэрнэту рэчаў. Новы рэзідэнт Парку высокіх тэхналогій «Надзейныя праграмы» аказвае паслугі па рэгістрацыі даменных імёнаў, віртуальнага хостынгу і электроннай пошты, прапануе воблачныя рашэнні для бізнесу.

Шэраг кампаній распрацоўваюць адукацыйныя праграмы для анлайн-навучання. «Кіндэрсонг» працуе над праграмай, прызначанай для трэніроўкі спеваў шляхам аналізу гукавой інфармацыі. «Астоніа» ствярае платформу для дыстанцыйных курсаў па дадатковай адукацыі. У ПВТ прынялі вялікую колькасць кампаній з гульнявой індустрыі, сферы воблачных тэхналогій, фінтэху, электроннай камерцыі, медыцыны.

Таксама ў ПВТ прыйшлі рэзідэнты з замежным капіталам з ЗША, Швецыі, Швейцарыі, Ізраіля, Мальты, Канады. Паводле прадстаўленых праектаў новыя рэзідэнты Парку высокіх тэхналогій плануюць ажыццяўляць прадуктовыя, заказныя і змяшаныя бізнес-мадэлі. Большасць кампаній — новых рэзідэнтаў ПВТ заснаваныя ў 2018—2019 гадах. Шэсць кампаній пашырылі свае віды дзейнасці.Такім чынам, на сённяшні дзень у Парк высокіх тэхналогій уваходзяць ужо 563 кампаніі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Аты-баты

# З ВЫПУСКНЫМІ ПАГОНАМІ

**Іх атрымалі ў суботу 59 выхаванцаў Мінскага суvoраўскага ваеннага вучылішча. Тром з іх уручылі атэстаты асобага ўзору з залатым медалём.**



Фота mil.by

— Спачатку было вельмі складана, — кажа **Іван УРБАНОВІЧ, адзін з медалістаў.** — Тут вучыцца нашмат цяжэй, чым у звычайнай школе. Час, у тым ліку і на самападрыхтоўку, жорстка рэгламентаваны. Калі чагосьці не паспеў, то давядзецца пасля наганяць. Суvораўцам стаў дзякуючы бацькам — менавіта яны расказалі пра вучылішча, калі я быў яшчэ ў шостым класе. Я падумаў і вырашыў, што тут я атрымаю адукацыю лепшую, чым у сябе дома.

Іван Урбановіч будзе паступаць на ваенны факультэт БДУ. Яго спецыяльнасць будзе звязана з радыяцыйнай, хімічнай і біялагічнай абаронай.

— За час, праведзены тут, я крыху асвоіў ваенную справу — страявыя прыёмы, даведаўся характарыстыкі зброі, навучыўся страляць, — кажа хлопец. — А яшчэ вучылішча дало разуменне сапраўднага сяброўства, якое правяраецца не толькі ў паўсядзённым навучанні, але і падчас палявых выездаў на палігоны. Стаць суvораўцам не так і проста. Давядзецца прайсці праз уступныя экзамены — здаць мову, матэматыку, фізкультуру і прайсці псіхалагічны тэст. Калі вы працавітыя, то ўсё атрымаецца.

— Гэта радасны і сумны, але святочны дзень, — кажа **начальнік Мінскага суvораўскага ваеннага вучылішча Аляксандр НАВУМЕНКА.** — У нас 63-і выпуск. Пераважная большасць тых, хто зараз стаіць на пляцы, у далейшым выбралі дарогу, звязаную з вышэйшымі навучальнымі ўстановамі Міністэрства абароны. Хлопцы, якія правучыліся тут пяць гадоў, значна адрозніваюцца ад сваіх равеснікаў, якія заканчваюць сярэднія школы, сваёй дарослацю, уменнем ацэньваць абстаноўку навокал, разуменнем і веданнем людзей і сяброўствам. Акрамя высокага ўзроўню агульнаадукацыйнай падрыхтоўкі яны спасцігаюць азы вайсковай навукі і гатовы да выканання абавязкаў камандзіраў аддзяленняў і намеснікаў камандзіраў узводаў у ваенных навучальных установах.

Павіншаваць выпускнікоў прыйшоў **міністр абароны Андрэй РАЎКОЎ,** які сам скончыў Суvораўскае вучылішча.

— Незалежна ад таго, які шлях выберуць сённяшнія выпускнікі, сцены вучылішча яны пакідаюць са сфарміраванымі поглядамі на жыццё і дакладна акрэсленымі мэтамі, да якіх яны рухаюцца. Прывітая ў вучылішчы дысцыпліна вельмі дапамагае маладым людзям далей па жыцці.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

# Мазаіку памяці выкладваюць краязнаўцы

**XXVI Дзень беларускага пісьменства пройдзе на Гродзеншчыне — у старажытным Слоніме. Да свята прыгожага пісьменства рыхтуюцца не толькі ў вобласці і раённым цэнтры. Падарункі Дню беларускага пісьменства ўжо адзін за адным імкнуцца зрабіць і кніжныя выдавецтвы краіны.**





У мінскім «Кнігазборы» выйшла кніга дасведчанага збіральніка гістарычных памятак Айчыны Сяргея Чыгрына «Гістарычная мазаіка Слонімшчыны». Вядомы ў краіне краязнаўчы пісьменнік склаў своеасаблівую міні-энцыклапедыю. Лаканічны аповед выкананы з прывязанасцю да гістарычных адрэзкаў часу. Вось назвы некаторых артыкулаў: «Гісторыя Слоніма пачынаецца з 1036 года»; «Слонімскі замак»; «Пра раскопкі ў Слоніме»; «Першая кніга пра Слонім»; «Італьянская каханка Агінскага»; «Руіны палаца Агінскіх, пачатак XIX стагоддзя»; «Слонімскія габелены Агінскага»; «Мапы Слонімшчыны»; «Вяскоўцы Слонімскага павета, 1860-я гады»; «Такі палац быў у Навадзявяткавічах»... Назвы пераконваюць (і, паверце, змест — таксама), што кніга дазваляе ажыццявіць цікавае, насычанае добрымі сустрэчамі, віртуальнае падарожжа па Слонімшчыне.

З «Гістарычнай мазаікай Слонімшчыны» можна смела ісці на школьны ўрок гісторыі, а мо нават — і не толькі гісторыі. А тое, што кнігу варта смела выкарыстоўваць у арганізацыі краязнаўчай работы ў рэгіёне, дык у гэтым можна не сумнявацца. Ведаючы, як зацёды ставяцца да зробленага аўтарытэтным гістарычным і краязнаўчым пісьменнікам Сяргеем Чыгрыным, будзьце ўпэўнены, што кніга разыдзецца сярод чытачоў, пакупнікоў яшчэ задоўга да свята. Нагадаем, што наклад яе — усяго 200 экземпляраў. Добра было б да XXVI Дня беларускага пісьменства ўсё ж такі зрабіць перавыданне «Гістарычнай мазаікі Слонімшчыны» Сяргея Чыгрына самым масавым накладам. Гэта будзе добрым прыкладам гісторыка-публіцыстычнай, кнігавыдавецкай руплівасці яшчэ і ў сувязі з тым, што ў 2018—2020 гадах краіна жыве пад знакам Года малой радзімы.

**Сяргей ШЫЧКО.**

### Уцякаў ад патрульнай машыны і трапіў у ДТЗ

**Раніцай нарад ДПС у Віцебску заўважыў на вуліцы Воінаў-Інтэрнацыяналістаў аўтамабіль «Таёта», які занесла ўбок. У адказ на патрабаванне спыніцца кіроўца зрабіў спробу ўцячы.**

Праваахоўнікі ўключылі маячкі, аднак аўтамабіль працягваў рух. У выніку кіроўца не справіўся з кіраваннем і вылецеў у кювет. На месцы ДТЗ ён быў затрыманы. Па інфармацыі аддзялення агітацыі і прапаганды ДАІ УУС Віцебскага аблвыканкама, за рулём іншамаркі знаходзіўся п'яны 18-гадовы жыхар Віцебска, які не меў пасведчання кіроўцы. На пасажырскім сядзенні знаходзілася яго непаўналетняя знаёмая. У дачыненні да кіроўцы былі складзеныя пратаколы за кіраванне ТС у стане алкагольнага ап'янення, асобай, якая не мае права кіравання, за адсутнасць дамовы абавязковага страхавання, а таксама іншых правіл дарожнага руху. Машына змешчана на штрафстаянку.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Надвор'е

# СОНЦА ВЫРАШЫЛА НАС РАСПЛАВІЦЬ

## Калі ў выпрабаванні на максімальны градус плюс 34 не мяжа

**Сапраўды анамальная спякота ў нашай краіне на гэтым тыдні працягвае ўзмацняцца. У дзённыя гадзіны тэмпература паветра ў многіх раёнах перавысіць плюс 30 градусаў.**



Пры гэтым на фоне павышанага атмасфернага ціску будзе пераважна без ападкаў, толькі ў другой палове тыдня месцамі не абыдзецца без лакальных навальнічных дажджоў. У сувязі з гарачым надвор'ем павышаецца ўзровень пажарнай небяспекі ў лясах, дзе трэба быць вельмі асцярожнымі з агнём, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Сёння ўдзень у вобласці павышанага атмасфернага ціску будзе пераважна без ападкаў. Максімальная тэмпература паветра складзе ад плюс 27 да плюс 33 градусаў. У сераду будзе пераважна без ападкаў, толькі ўдзень у асобных раёнах па поўначы краіны магчымы кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 14 да плюс 20 градусаў, удзень — 26—33 цяпла.

Паводле прагнозаў айчынных сіноптыкаў, 13 і 14 чэрвеня нас чакае чарговае выпрабаванне спякотай. У чацвер уначы будзе пераважна без ападкаў, а ўдзень у асобных раёнах краіны чакаюцца кароткачасовыя дажджы з навальніцамі. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 16 да плюс 21 градуса, удзень — ужо 27—34 цяпла. Гарачае надвор'е захаваецца ў нашай краіне і ў пятніцу. Уначы ў асобных раёнах па захадзе, а ўдзень месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя навальнічныя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе 14—21 градус вышэй за нуль, а ўдзень будзе прыпякаць да 27—34 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Фестывалім

# ПАД МУЗЫКУ ЦЫМБАЛАЎ

**Трыццаты раз адзвінелі цымбалы і гармонікі на міжнародным фестывалі народнай музыкі, які праходзіць у Паставах пад эгідай Міністэрства культуры і Віцебскага аблвыканкама і збірае штогод сотні музыкаў і гасцей з розных краін. Сёлета ўдзел у ім узялі выканаўцы і творчыя калектывы з Беларусі, Расіі, Украіны, Літвы, Латвіі, Эстоніі і Грузіі.**



Фота БелТА.

Старажытныя Паставы, якія, дарэчы, адзначаюць сёлета 610-годдзе, у мінулыя выхадныя ператварыліся ў вялікую канцэртную залу з 10 сцэнічнымі пляцоўкамі. Арганізатары прапанавалі гасцям фэсту насычаную і разнастайную праграму: тэатралізаванае прадстаўленне «Музыка беларускіх палацаў і сядзіб», кірмаш народных рамёстваў, «Пастаўскі баль», конкурс вясковых падворкаў, музейныя экспазіцыі, мастацкія выстаўкі, спартыўныя спаборніцтвы, вогненнае шоу і маладзёжную дыскатэку. Завяршылася ж свята народнай музыкі тэатралізаваным шэсцем і гала-канцэртам удзельнікаў.

У традыцыйным конкурсе «Хто каго?» выканаўцы і калектывы пацвярджалі ўласным прыкладам, што традыцыі ігры на народных інструментах захоўваюцца і развіваюцца, а прафесійнае журы на чале з народным артыстам Беларусі, мастацкім кіраўніком і дырыжорам Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра імя І. Жыновіча Міхаілам Казінцом, выбірала найлепшых. У лік пераможцаў фестывалю «Звіняць цымбалы і гармонік» увайшлі цымбалістка Ганна Мацвейка з Навапалацкага музычнага каледжа, навучэнцы Пастаўскай дзіцячай школы мастацтваў, аматарскі ансамбль народнай музыкі і песні «Стрэчанне» Палаца культуры Мазырскага нафтаперапрацоўчага завода, ансамбль «Шчодрыца» Мінскага гарадскога палаца культуры і іншыя.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**